парламентом Франции в 2013 г., принятие антидискриминационного закона в Грузии в 2014 г. при огромном социальном несогласии с этими решениями говорят сами за себя. В рамках государства антропологические критерии выявлены быть не могут из-за совершенно иной – институциональной – природы государственной деятельности, что, однако, не означает чего-то самого по себе негативного. Это просто объективный факт любой институциональной формы, в этом заключена специфическая особенность государственной деятельности. По этой причине в антропологической концепции права не система и институты, а личность в праве является ориентиром правового. Парадоксально, но именно такой подход способствует эффективному функционированию государства в выполнении им своего социального назначения.

Таким образом, рассмотрение государства в контексте проблемы правогенеза должно осуществляться посредством методологической переориентации – от поиска правоустанавливающего авторитета между оппонирующими государству субъектами – к поиску критериев ценностных правовых содержаний и вменения государству обязанности их институциональной поддержки. В этом, как видится, и заключается роль современного государства как института обеспечения социальной стабильности и свободы человека.

**Списков использованных источников**


1. Нерсесянц, В.С. Общая теория права и государства / В.С. Нересянц. – М. : ИНФРА М, 1999. – 552 с.
2. Мамут, Л.С. Социальное государство с точки зрения права / Л.С. Мамут // Государство и право. – 2001. – № 7 – С. 5–14.
3. Фуко, М. Рождение биополитики. Курс лекций, прочитанных в Коллеж де Франс в 1978–1979 учебном году : пер. с фр. А.В. Дьяков / М. Фуко. – СПб., 2010. – 446 с.
4. Гурвич, Г.Д. Идея социального права / пер. М.В. Антонова, Л.В. Ворониной // Г.Д. Гурвич. Философия и социология права : избр. соч. – СПб. : Изд. дом С.-Петерб. ун-та, 2004. – С. 41–212.
5. Павлов, В.И. Проблемы теории государства и права : учеб. пособие / В.И. Павлов. – Минск : Акад. МВД, 2017. – 262 с.
6. Павлов, В.И. К вопросу об антропологическом типе правопонимания / В.И. Павлов // Правоведение. – 2015. – № 4. – С. 71–97.
7. Зорькин, В.Д. Суть права / В.Д. Зорькин [Электронный ресурс] // Вопр. философии. – 2018. – № 1. – Режим доступа: http://vphil.ru/index.php?option=com_content&task=view&id=1851&Itemid=52. – Дата доступа: 07.03.2018.


Дата поступления в редакцию: 16.03.18

***V.I. Pavlov****, Candidate of Juridical Sciences, Associate Professor, Head of the Department of the Theory State and Law History of the Academy of the MIA of the Republic of Belarus*

STATE AND LAW GENESIS IN THE ANTHROPOLOGICAL APPROACH TO THE LAW

*The article deals with the problem of modern approaches to the state in the context of law genesis problems. It is proved that the liberal approach to the state, considering it from a position of usurpation of civil liberties, lose relevance today. Binding and violation of basic human rights today are increasingly carried out just on the background of the traditional weakness of the State in which one of the first drew attention to M. Foucault. Anthropology of law as a guide for law genesis offers dis-regarded not the state, and the practice of legal existence, rooted in the civilization and cultural patterns and basic values of a society, and in this case the state can address one of the main remedies.*

*Keywords: legal anthropology, person, people, state, value.*

УДК 947.6 + 930

***А.М. Сувалаў****, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь*
*(e-mail: suvalau@tut.by)*

## ДАСЛЕДАВАННІ ЭТНАГЕНЕЗУ БЕЛАРУСАЎ У 40-х гг. XX ст.

*Разглядаюцца асноўныя падыходы ў вывучэнні беларускага этнасу ў 40-х гг. XX ст., перш за ўсё такіх вучоных, як У.В. Маўродзін, М.С. Дзяржавін, А.П. П'янкоў, Ф.Т. Канстанцінаў і У.І. Пічэта. Аналізуюцца асноўныя*

*навуковыя і ненавуковыя фактары, якія ўплывалі на фарміраванне падыходаў да праблемы этнагенезу беларусаў у перадваенны час, у Вялікую Айчынную вайну і ў першыя пасляваенныя гады.*

*Ключавыя словы: беларусы, этнагенез, гістарыяграфія, навуковая канцэпцыя, этнаграфія, этнас.*

Перыяд 40-х гг. XX ст. мае некалькі падперыядаў, якія кардынальна адрозніваюцца паміж сабою. Першы – час да пачатку Вялікай Айчыннай вайны, калі Другая сусветная вайна ўжо пачалася, калі да БССР была вернута частка беларускіх этнічных тэрыторый, але для большай часткі краіны (СССР) яшчэ працягвалася мірнае жыццё. У навуковым плане ў гэты час ажыццяўляюцца ранейшыя даследаванні, з'яўляюцца некаторыя новыя падыходы ў вывучэнні праблемы этнагенезу беларусаў. Другі падперыяд – час Вялікай Айчыннай вайны – не самы лепшы час для правядзення грунтоўных навуковых даследаванняў па этнагенезу і іншых праблемах гістарычнага мінулага. Выключэнне складаюць толькі тыя тэмы, якія ў сувязі з надзённымі запатрабаваннямі часу могуць паспрыяць мабілізацыі грамадства на барацьбу з ворагам. Іншымі словамі кажучы, інтарэс да пэўнай тэмы быў звязаны з ідэалагічнымі запатрабаваннямі часу, і адпаведна мэты публікацый аўтараў у большай ступені былі арыентаваны не на атрыманне навуковых вынікаў, а на перакананне чытача ў правільнасці адстойваемых палітычных і ідэалагічных пазіцый. Адпаведна паколькі асноўнымі спажыўцамі або аўдыторыяй, на якую арыентаваліся аўтары, з'яўляліся не вузкія спецыялісты-прафесіяналы, а шырокія колы грамадства, то і сродкі давядзення поглядаў насілі не столькі навуковы, колькі навукова-публіцыстычны характар. Пасляваенны падперыяд – час, калі эйфарыя ад перамогі над нацыянал-сацыялізмам (нямецкім фашызмам) суправаджалася жаданнем канчаткова перамагчы звергнутага ворага ва ўсіх магчымых сферах жыццядзейнасці, у тым ліку цалкам развянчаць яго расавыя тэорыі і нейтралізаваць спробы раз'яднаць адзінства савецкага народа-пераможцы.

Непасрэдна перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны пабачыў свет першы з запланаванай серыі зборнік, прысвечаны этнагенезу славян, які быў падрыхтаваны Інстытутам гісторыі матэрыяльнай культуры імя М.Я. Мара Акадэміі навук СССР [1]. Указаная серыя публікацый з выкарыстаннем археалагічных матэрыялаў павінна была вырашыць «адну з самых важных і вострых навуковых праблем» – праблему этнагенезу ўсходніх славян [1, с. 7]. Па сцвярджэнню аўтараў зборніка, да апошняга часу (да 1941 г.) археалагічныя даныя не карысталіся сярод гісторыкаў дастатковым прызнаннем у якасці крыніцы па тэме этнагенезу таго ці іншага народа [1, с. 7]. Метадалагічна значным і новым для навукі таго часу было прызнанне археалагічных матэрыялаў у якасці паўнавартаснай гістарычнай крыніцы пры правядзенні даследаванняў этнагенезу ўсходніх славян [1, с. 7]. Вельмі малая колькасць пісьмовых крыніц, якія можна было б выкарыстаць пры правядзенні этнагенетычных даследаванняў, дазваляла будаваць даволі розныя канцэпцыі. Апошнія маглі ўтрымліваць вялікую колькасць дапушчэнняў і меркаванняў. У сувязі з чым прыцягненне новых крыніц, матэрыяльных рэшткаў культуры былога насельніцтва рэгіёнаў, дзе, па меркаванню аўтараў, славяне цалкам ці ўсходнія ў прыватнасці сфарміраваліся ў якасці самастойнай адзінкі, ставіла вывучэнне праблемы этнагенезу на новы і якасны падмурак, значна звужала поле markaraznaga роду дапушчэнняў і галаслоўных меркаванняў. Зазначым, што пашырэнне крыніцазнаўчай базы па даследаваннях праблемы этнагенезу беларусаў праз уключэнне даных археалогіі, вельмі паспрыяла навуковаму абгрунтаванню тэорый і канцэпцый этнагенезу славян, у тым ліку і этнагенезу беларусаў, але нельга перабольшваць значэнне даных археалогіі, якія можна выкарыстоўваць пры вывучэнні дадзенай тэмы толькі разам і ва ўзаемасувязі з данымі іншых навуковых дысцыплін.

У фарміраванні падыходаў да праблемы этнагенезу ўсходнеславянскіх народаў у гэты перыяд віднае месца займала асоба У.В. Маўродзіна. Нягледзячы на тое што асноўныя работы паважанага даследчыка па ўказанай тэматыцы пабачылі свет пазней, асноўныя яго ідэі можна прасачыць і па публікацыях 40-х гг. XX ст. Так, ужо па першых работах, прысвечаных гісторыі Усходняй Еўропы, бачна, што У.В. Маўродзін аб'ядноўваў усё ўсходняе славянства пад найменнем «рускія». У сітуацыях, калі неабходна было падкрэсліць, што гаворка ідзе толькі пра частку ўсходніх славян, аўтар дадаваў эпітэт «уласна» рускія («собственно русские, т. е. великорусские») [2, с. 5], а калі гаворка ішла пра ўкраінцаў, паняцце «рускія» бралася чамусьці ў двухкоссе, або таксама рабілася ўдакладненне кшталту «носители «русской», г. зн. украінскай, культуры» [2, с. 23]. З'яўляючыся прыхільнікам і папулярызатарам «масквацэнтрысцкай» кан-

цэпцыі В.В. Ключэўскага, У.В. Маўродзін даследаваў і выкарыстоўваў у асноўным матэрыялы ўсходняй часткі ўсходнеславянскага рэгіёна.

Так, У.В. Маўродзін, у адрозненне ад М.Я. Мара і М.С. Дзяржавіна, быў прыхільнікам ідэі перасялення славян на тэрыторыю Усходняй Еўропы з Падунаў'я (перш за ўсё з тэрыторый цяперашніх Венгрыі і Балгарыі) [3, с. 20, 21]. Аўтар адштурхоўваўся ад двух пастулатаў тагачаснай савецкай гістарычнай навукі: народ нікуды не знікае, таму славяне (як і іншыя народы) ёсць вынік асіміляцыі «дзесяткаў і сотняў дробных плямен ...» [3, с. 22–23]; усе перасяленні народаў «як правіла, не закранаюць асноўных мас насельніцтва ... як фізічнай велічыні» [3, с. 23]. Такім чынам, ён сумясціў ідэю аўтахтоннасці славянскага насельніцтва, якой прытрымліваліся М.Я. Мар, М.С. Дзяржавін і інш., з вядомай з'явай ў гісторыі Еўропы – Вялікім перасяленнем народаў. Даследчык таксама імкнуўся ідэнтыфікаваць некаторыя археалагічныя культуры як славянскія. Так, па яго меркаванню, у III–V ст. н. э. на тэрыторыі Прыкарпацця і Сярэдняга Дняпра пачынаюць зліваца ў два «ачага» этнагенезу ўсходніх славян, якія ўяўлялі «аславянізаваныя рэшткі гэта-дакійскіх, скіфскіх і сармацкіх плямён, а таксама далёкія нашчадкі тых, каго грэкі называлі гетамі, а рымляне – дакамі, бесамі, кастабокамі і г. д.» [3, с. 41]. Так, у сваіх даследаваннях У.В. Маўродзін імкнуўся выкарыстоўваць матэрыялы археалогіі, гісторыі, мовазнаўства і антрапалогіі.

У час вайны тэма этнагенезу беларусаў выкарыстоўвалася ў якасці аргумента пры вядзенні ідэалагічнай барацьбы. Асноўныя прапагандысты з боку нацыянал-сацыялістаў, прадстаўнікі беларускіх калабарцыяністаў, выступаючы на баку фашысцкай Германіі, выкарыстоўвалі гістарычны матэрыял для доказу прыналежнасці беларусаў да ліку еўрапейскіх народаў. Імпліцыдна па іх публікацыях адчуваецца імкненне давесці наяўнасць розніцы перш за ўсё паміж двума ўсходнеславянскімі народамі: велікарусамі і беларусамі. Жаданне падкрэсліць самастойнасць беларускага народа, яго старажытнасць і адасобленнасць ад суседзяў прасочваецца ў прапагандысцкіх публікацыях акупацыйных улад. Аднак інтарэс у рамках артыкула састаўляюць навуковыя пазіцыі і погляды аўтараў і суадносна – падобныя крыніцы перыяду акупацыі.

Па падліках Ю. Туронка, падчас фашысцкай акупацыі ў Беларусі выйшлі 52 кнігі (для параўнання: у адной Латвіі – 1 500) [4, с. 32]. Калі яшчэ ўлічыць памеры краін і колькасныя паказчыкі насельніцтва, то маштаб публікацыйнай дзейнасці ў Беларусі перыяду акупацыі будзе выглядаць больш чым сціпла. Пры гэтым толькі частка з апублікаваных кніг мела дачыненне да праблемы этнагенезу беларусаў. У гэтай сувязі варта ўзгадаць апублікаваны ў час нямецка-фашысцкай акупацыі папулярны нарыс Я.А. Найдзюка па гісторыі «Беларусь учора і сёння». Гэта было фактычна другое, перапрацаванае і дапоўненае аўтарам выданне нарыса 1940 г. Нарыс выйшаў пад рэдакцыяй І. Сівіцы, працаўніка аддзела культуры і палітыкі Генеральнага камісара Беларусі. Па сцвярджэнню А.П. Грыцкевіча, І. Сівіца паправіў тэкст падручніка ў кірунку, які адпавядаў нямецкай палітыцы ў Генеральнай акрузе Беларусь [5, с. 402]. Пры перавыданні гэтай публікацыі ў 1993 г. рэдактарскія праўкі І. Сівіца з прапагандысцкім характарам былі апушчаны, а ў тэкст Я.А. Найдзюка вярнулі тыя часткі, якія тычыліся перамогі славянскіх народаў над ордэнскімі войскамі пад Грунвальдам у 1410 г. і іншыя падобныя ім матэрыялы. У сваіх поглядах на этнагенез беларусаў Я.А. Найдзюк не выказвае нейкіх арыгінальных ідэй. Па-першае, ён казаў аб прышласці славянскага элемента ва Усходняй Еўропе з тэрыторый паміж Дняпром, Віслай і Карпатамі [5, с. 12]. Па-другое, сярод продкаў беларусаў ён указвае шэсць славянскіх плямён: крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, вяцічаў, севяран і драўлян [5, с. 13]. Па-трэцяе, «расавыя» карані беларусаў даследчык бачыў як вынік «зліцця» прышлых славян з мясцовымі балтамі (яцьвягамі і голядзю) [5, с. 14]. І апошняе, час выдзялення мовы беларусаў з праславянскай мовы адносіўся ім да перыяду не пазней VI ст. н. э. [5, с. 15]. Іншымі словамі, аўтар ніяк не абазначаў наяўнасць нейкага сумеснага з іншымі ўсходнеславянскімі народамі перыяду этнічнага развіцця. Нарыс Я.А. Найдзюка стаў адной з нямногіх публікацый, дзе закранаася праблема этнагенезу беларусаў, і якую можна хаця б часткова аднесці да ліку навуковых.

Таксама нельга сказаць, што ў перыяд Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны савецкія вучоныя адводзілі значнае месца даследаванню праблемы этнагенезу беларусаў. Інтарэс часцей узнікаў з запатрабаванняў часу, паколькі дзейнічаў лозунг: «Усё для фронту, усё для Перамогі». Таму зразумела, што на першы план выступала ідэя ўсенароднай барацьбы народаў Савецкага Саюза, аб'яднаных не толькі агульнымі ідэаламі, але і гістарычнай роднаснасцю і блізкасцю

беларусаў, украінцаў і рускіх (велікарусаў). Указанай акалічнасцю тлумачыцца тое, што публікацыі на тэму паходжання і этнічнай прыналежнасці беларусаў пачалі публікавацца больш інтэнсіўна адразу з заканчэннем Вялікай Айчыннай вайны. Бачна, што гэта свайго роду спрэчка «post factum» без указання пазіцый апанентаў, якія былі не столькі навукоўцамі, з якімі неабходна весці прадметную дыскусію, колькі проста здраднікамі Радзімы і савецкіх ідэалаў. Па праблеме этнагенезу беларусаў былі апублікаваны работы М.С. Дзяржавіна, Ф.Т. Канстанцінава, У. І. Пічэты і А.П. П'янкова [6–10]. Указаныя публікацыі, акрамя работы М.С. Дзяржавіна, даволі сціслыя па памерах, больш падобныя на брашуры. Кожная з іх утрымлівае да 40 старонак тэксту і была першай спробай асэнсавання праблемы этнагенезу беларусаў, якія ўтрымліваюць толькі канцэптуальныя палажэнні і вызначаюць поле для будучых больш грунтоўных даследаванняў.

Першае месца і па часе з'яўлення і па сваім значэнні мае работа М.С. Дзяржавіна «Паходжанне рускага народа: велікарускага, украінскага і беларускага» (1944 г.), выдадзеная па асабістаму ўказанню І.В. Сталіна [6, с. 4]. Ужо пасля вайны ў 1948 г. за «Паходжанне рускага народа: велікарускага, украінскага і беларускага» і «Славян у старажытнасці» М.С. Дзяржавін атрымаў Сталінскую прэмію 1-й ступені. Указанне на апошняе падкрэслівае наш тэзіс аб афіцыйным прызнанні ідэй і палажэнняў, выказаных аўтарам адносна этнагенезу ўсходнеславянскіх народаў у цэлым і беларусаў у прыватнасці ў гэтых публікацыях.

М.С. Дзяржавін, як і яго настаўнік М.Я. Мар, лічыў славян аўтахтонным насельніцтвам: ні адзін «народ не знікае бясследна са сваіх месцаў пасялення, … працягвае пераемнасна жыць у культурнай спадчыне наступных насельнікаў той жа тэрыторыі» [6, с. 8]. Так, М.С. Дзяржавін выводзіў усходніх славян з земляробчых плямён старажытнай Скіфіі, носьбітаў трыпольскай археалагічнай культуры, у якіх ён бачыў выключна толькі продкаў праславян (або протаславян) [6, с. 9]. Паколькі, па перакананню аўтара, з эпохі палеаліту і да наступлення жалезнага веку на гэтых тэрыторыях жыў адзін і той жа «ў асноўным ядры» народ, які «ў цэлым дае пэўны этнаграфічны тып», то «мы не маем ніякіх падстаў не бачыць у гэтым тыпе субстрат пазнейшага славянскага насельніцтва … усходніх славян – украінцаў, беларусаў, велікарусаў» [6, с. 10]. Такім чынам, старажытнасць Русі адносілася на часы больш старадаўнія, чым з'явіліся варагі, што пазбаўляла прыхільнікаў нарманскай тэорыі якіх-небудзь аргументаў. Па меркаванню даследчыка, «нашы продкі» пражываюць на «тэрыторыі Савецкага Саюза» прыблізна сорак тысяч гадоў [6, с. 10]. Тэрытарыяльна ядро протаславянскай народнасці знаходзілася ў басейне сярэдняга Дняпра і Прыпяці – на тэрыторыях сучаснай Украіны і Беларусі. Цікава гучыць і палажэнне пра паходжанне рускага народа з глыбокай старажытнасці, калі пра «рускі народ як пра асаблівую этнаграфічную групу на еўрапейскім мацярыку не было яшчэ і гаворкі» [6, с. 7]. Зыходзячы з вышэйзгаданых разважанняў, М.С. Дзяржавін прыходзіць да сцвярджэння, што ўжо з першых стагоддзяў нашай эры ўсе славяне Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (ад Дона і вярхоўяў рэк Акі і Волгі на ўсходзе і да Эльбы (славянская Лаба) і басейна яе прытока Заалы на захадзе; ад Эгейскага мора, паўночнага Прычарнамор'я і Прыазоўя на поўдні і да Балтыйскага пабярэжжа і Ладажскага возера на поўначы), па мове, звычаях і ўсяму парадку свайго жыцця, складалі ў цэлым адзін народ [6, с. 42]. Праўда, ён прызнаваў, што гэты народ быў падзелены на мноства разрозненых плямён [6, с. 42]. Логіка этнагенезу беларусаў, як і іншых славянскіх народаў, па меркаванню М.С. Дзяржавіна, у развіцці аўтахтонных элементаў ад поўнага адзінства да паступовага распаду на паасобныя адзінкі, а затым і на яшчэ больш дробныя элементы. Так, з адзінага славянскага народа выдзяляюцца тры групы славянскіх народаў: усходнія, заходнія і паўднёвыя славяне. А затым гэтыя тры групы славян падзяляюцца на паасобныя народы: усходнія славяне – на велікарусаў, украінцаў і беларусаў, заходнія славяне – на чэхаў, славакаў, сербаў-лужычан, палякаў і паморскіх кашубаў са славінцамі, і паўднёвыя славяне – на славенаў, харватаў, сербаў, македонцаў і балгар [6, с. 42].

Адносна ўсходніх славян М.С. Дзяржавін, спасылаючыся на «Аповесць мінулых гадоў», пералічвае дванаццаць плямён VIII–X ст., якія складалі «ў цэлым рускі народ» [6, с. 42–43].

М.С. Дзяржавін неаднойчы падкрэсліваў тэзіс пра існаванне адзінага рускага народа, які складаецца з трох брацкіх народаў: велікарусаў, украінцаў і беларусаў [6, с. 7]. Менавіта гаворка ідзе не пра «народнасці», а пра «народы». Таксама паказальны момант: у межах адной і той жа работы паралельна выкарыстоўваюцца паняцці «велікаросы» і «велікарусы» для абазначэння

адной з галін адзінага рускага народа [6, с. 7, 10, 42]. Важна не блытаць «велікарускі народ» з «вялікім рускім народам», пад якім М.С. Дзяржавін мае на ўвазе ўсіх усходніх славян, а не толькі яго частку – велікарусаў [6, с. 45].

Публікацыя Ф.Т. Канстанцінава (1946 г.) прадстаўляла сабой скарочаны варыянт лекцыі, прачытанай аўтарам у Доме партыйнай асветы. Сам аўтар у сваіх поглядах прытрымліваўся ідэі аўтахтоннасці славянскага насельніцтва Беларусі і вызначыў асноўныя этапы станаўлення беларускага народа, пры гэтым акцэнт рабіўся на спрадвечную цягу беларусаў да сваіх адзінакроўных братоў-расіян (велікарусаў). У дадзеным палажэнні якраз і праяўляецца завочная дыскусія ідэалагічнага зместу, выкліканая абставінамі Другой сусветнай вайны. Астатнія палажэнні з'яўляліся пераказам канцэпцыі Я.Ф. Карскага.

На матэрыялах публічнага выступлення 1948 г. была заснавана і невялікая па памерах работа доктара гістарычных навук А.П. П'янкова «Паходжанне беларускага народа». Матывам яе з'яўлення стала неабходнасць барацьбы з трактоўкамі этнагенезу беларусаў, якімі карысталіся «беларускія нацыяналісты» (указваюцца аўтарам). Апошнія «цалкам няправільна адлюстроўвалі працэс фарміравання беларускага народа: паходжанне яго яны адрывалі ад гісторыі братніх народаў – рускага і ўкраінскага», канстатавалася, што ўсходнеславянскія народы маюць агульнае паходжанне і агульныя шляхі гістарычнага развіцця [10, с. 3]. Даследчык заяўляў, што не пагаджаецца з прыхільнікам ідэі міграцыі славянскіх плямён на тэрыторыю Усходняй Еўропы «ў гатовым выглядзе» [10, с. 3–4]. Пагаджаючыся з М.Я. Марам аб неперапынным развіцці насельніцтва на тэрыторыі Беларусі з часоў палеаліту, ён лічыў, што фарміраванне плямён, з якіх пазней склаліся ўсходнеславянскія народы, прадстаўляла сабой «прадукт складанага скрыжавання розных больш ранейшых плямён» [10, с. 4]. Сярод продкаў славян ён называў скіфаў, неўраў, венедаў і скалотаў. А.П. П'янкоў лічыў венедаў продкамі як славян, так і балтаў, летаў, ліваў, літоўцаў, жмудзінаў, прусаў і г. д. Ад імя апошніх А.П. П'янкоў выводзіў і этнонім «славяне» [10, с. 4]. Уласна, продкамі беларусаў даследчык называе тры славянскія плямёны (крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў), а таксама «літоўскае» племя яцьвягаў, якія падверглася культурнаму ўплыву з боку ўсходніх славян [10, с. 7, 13]. Ён яшчэ не карыстаецца паняццем «старажытнаруская народнасць», але выдзяляе перыяд Кіеўскай Русі ў якасці агульнага этапа этнічнага развіцця ўсходнеславянскіх народаў [10, с. 7]. Такім чынам, выдзяленне ўсходнеславянскіх народаў у самастойныя этнічныя ўтварэнні (народнасці) адносілася да часоў феадальнай адасобленасці XIV–XVI ст. [10, с. 8, 14, 15]. Галоўнымі фактарамі, якія спрыялі фарміраванню беларусаў, А.П. П'янкоў называў эканамічны (развіццё феадальных адносін) і палітычны (захоп літоўскімі феадаламі будучых беларускіх зямель і далучэнне іх да Вялікага Княства Літоўскага, а пазней Рэчы Паспалітай) [10, с. 12–13, 18]. Менавіта па прычыне захопу літоўскімі феадаламі часткі зямель заходняй Русі даследчык лічыў правільным выводзіць этымалогію назвы «Чорная Русь» (землі, захопленыя Літвою) «у процівагу назве «Белая Русь» (землі на той час вольныя і свабодныя ад татара-мангольскага ярма) [10, с. 16–17].

Пазіцыя У. Пічэты «Утварэнне беларускага народа» (1946 г.) пабачыла свет ужо пасля Вялікай Айчыннай вайны ў часопісе «Вопросы истории» і кардынальна не адрознівалася ад класічных палажэнняў першай навуковай канцэпцыі этнагенезу беларусаў Я.Ф. Карскага. Аўтар пагаджаўся з Я.Ф. Карскім, што беларусы ўтварылі этнічную еднасць у выніку «скрыжавання» («скрещения») розных славянскіх і неславянскіх элементаў [9, с. 8]. Галоўная крытычная заўвага з боку У. Пічэты ў дачыненні да поглядаў Я.Ф. Карскага – неўказанне і няўлік ролі сацыяльна-эканамічных працэсаў у фарміраванні беларускага народа [9, с. 8]. Падобная заўвага – даніна марксісцка-ленінскай традыцыі ў савецкай гуманітарнай навуцы. Метадалогія савецкай гістарычнай навукі грунтавалася на палажэннях марксісцкай філасофіі аб дэтэрмініраванні эканомікай (базай) усіх іншых працэсаў у грамадстве. Такім чынам, лагічна (з пазіцый логікі прыхільнікаў марксісцка-ленінскай філасофіі і метадалогіі) указанне на падобнага роду памылку Я.Ф. Карскага, які сфармуляваў сваю канцэпцыю яшчэ ў дакастрычніцкі перыяд сваёй навуковай творчасці (канец XIX – пачатак XX ст.), калі марксісцка-ленінская метадалогія яшчэ толькі распрацоўвалася і не мела не тое што панавання, але і нейкага значнага пашырэння ў гістарычнай навуцы. Акрамя гэтай заўвагі У. Пічэта практычна нічога не дадаў да палажэнняў канцэпцыі Я.Ф. Карскага, а ў пытанні аб часе фарміравання беларускага народа пагаджаўся з паважаным акадэмікам [9, с. 8].

Такім чынам, задачы, якія ставілі сабе аўтары публікацый па праблеме этнагенезу беларусаў, такія як А.П. П'янкоў і Ф.Т. Канстанцінаў, былі дасягнуты толькі часткова. Была абазначана пра-

блема этнагенезу беларусаў, на аснове даследаванняў папярэднікаў (Я.Ф. Карскі, М.С. Дзяржавін і інш.) былі вызначаны асноўныя фактары ўзнікнення і развіцця такой этнічнай супольнасці як беларусы, былі зроблены спробы вызначэння часу ўзнікнення беларускага народа, вызначалася яго этнічная аснова (тры ўсходнеславянскія народнасці, ці племянныя саюзы крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў), рабіліся спробы вызначыць месца і ролю роднасных беларусам славян (перш за ўсё велікарусаў і ўкраінцаў) у фарміраванні нашых продкаў, уключыць у якасці аднаго з этапаў этнагенезу беларусаў перыяд агульнага этнічнага развіцця ўсходніх славян – старажытнарускую народнасць.

У пасляваенных публікацыях знайшлі сваё адлюстраванне не толькі погляды і канцэпцыі, якія палягалі ў коле навуковых спрэчак і дыскусій. Нават у навуковых выданнях знаходзім палажэнні, з'яўленне якіх было абумоўлена ідэалагічнай барацьбой. Гэта ёсць і ў А.П. П'янкова, і ў Ф.Т. Канстанцінава. Нягледзячы на даволі сціслыя памеры даследаванняў, на слабую аргументаванасць і грунтоўнасць, ідэі А.П. П'янкова і ў меншай ступені Ф.Т. Канстанцінава сталі на пэўны перыяд узорнымі, ці эталоннымі пры характарыстыцы этнічнага мінулага беларусаў, паколькі ідэалагічна яны былі вытрыманы і адпавядалі запатрабаванням свайго часу. З пачатку 50-х гг. XX ст., калі Інстытутам гісторыі АН БССР было распачата комплекснае даследаванне тэмы паходжання беларусаў, даследаванне праблемы набывае комплекснасць, значна павялічваецца колькасць і якасць публікацый па праблеме этнагенезу беларусаў. Але аналіз вынікаў даследаванняў гэтага перыяду ўжо выходзіць за рамкі артыкула.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Этногенез восточных славян : в 2 т. / под ред. М.И. Артамонова. – Т. 1. – М. ; Л. : изд-во АН СССР, 1941. – 288 с.

2. Мавродин, В.В. Образование русского национального государства / В.В. Мавродин. – 2-е изд. – М. : ОГИЗ. Госполитиздат, 1941. – 208 с.

3. Мавродин, В.В. Древняя Русь: происхождение русского народа и образование Киевского государства / В.В. Мавродин. – М. : ОГИЗ. Госполитиздат, 1946. – 312 с.

4. Скобла, М. Ахоўная сцяна Беларусі / М. Скобла // Наша вера. – 2011. – № 2. – С. 30–33.

5. Найдзюк, Я.А. Беларусь учора і сёння : папулярны нарыс з гісторыі Беларусі / Я.А. Найдзюк, І. Касяк. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 414 с.

6. Державин, Н.С. Происхождение русского народа: великорусского, украинского, белорусского. Славяне в древности / Н.С. Державин. – М. ; Минск : Рус. Правда, 2010. – 320 с.

7. Канстанцінаў, Ф. Аб паходжанні беларускага народа / Ф. Канстанцінаў // Бальшавік Беларусі. – 1945. – № 1–2. – С. 76–86.

8. Канстанцінаў, Ф.Т. Аб паходжанні беларускага народа / Ф.Т. Канстанцінаў. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1946. – 36 с.

9. Пичета, В.И. Образование белорусского народа / В.И. Пичета // Вопр. истории. – 1946. – № 5–6. – С. 3–29.

10. Пьянков, А.П. Происхождение белорусского народа / А.П. Пьянков. – Минск : Гос. изд. БССР, 1948. – 20 с.

Дата поступления в редакцию: 26.04.18

***A.M. Suvalau**, Candidate of Historical Sciences, Associate Professor, Lecturer at the Department of Theory and the History of State and Law of the Academy of the MIA of the Republic of Belarus*

STUDIES OF ETHNOGENESIS OF BYELORUSSIANS IN THE 40'S OF THE 20-TH CENTURY

*The article examines the main approaches to the study of the Belarusian ethnos in the 40's of the 20-th century. First of all, scientists such as Vl.V. Mavrodin, N.S. Derzhavin, A.P. P'yankov, F.T. Konstantinov and V.I. Picheta. The main scientific and non-scientific factors that influenced the formation of approaches to the problem of ethnogenesis of Belarusians in the pre-war period, during the Great Patriotic War, and in the first post-war years are analyzed.*

*Keywords: Belarusians, ethnogenesis, historiography, scientific conception, ethnography, ethnicity.*